7. Станкевіч, А. Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення / А. Станкевіч. – Вільня: Шлях моладзі, 1935 – 128 с.

8. Сташкевіч, М.С. “Менскае Беларускае прадстаўніцтва”. / М.С. Сташкевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т.. – Мінск: БелЭн, 1999. – Т. 5. – С. 115.

## МАСОНСКІЯ ЛОЖЫ НА БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКІХ ЗЕМЛЯХ У XIX – ПАЧАТКУ XX стст.

Багалейша С.В.,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт

У беларускай гістарычнай навуцы шмат якія сюжэты гісторыі Беларусі разглядаліся павярхоўна і аднабакова ці, наогул, не разглядаліся. Адным з такіх пытанняў з’яўляецца дзейнасць масонскіх арганізацый XIX – пачатку XX стст. на тэрыторыі Беларусі, Літвы і іх роля ў развіцці нацыянальнай ідэі, руху і нацыянальным адраджэнні. Гісторыя масонскіх ложаў пакуль рэдка была аб’ектам увагі беларускіх даследчыкаў. Няма ніякіх падстаў сцвярджаць, што ў тыя ці іншыя перыяды нашага мінулага масоны адыгрывалі значную ролю. Але прыцягвае ўвагу сам факт існавання таямнічых ложаў. Масонскія арганізацыі ў XIX–XX стст. адыгрывалі значную ролю ў грамадска-палітычным і культурным жыцці Еўропы і Новага Свету. Акутаныя таямніцамі і міфамі, масонскія ложы часцей за ўсё выконвалі функцыі дваранскіх клубаў, месцаў, дзе абмяркоўваліся і выспявалі палітычныя ідэі.

Трэба адзначыць, што непасрэднае дачыненне да віленскага масонства мелі вядомыя дзеячы беларускага нацыянальнага руху Антон і Іван Луцкевічы, Вацлаў Ластоўскі, Іван Краскоўскі і інш. Шматлікія кантакты паміж беларускімі, літоўскімі і яўрэйскімі дэмакратамі Віленшчыны адбываліся на паседжаннях масонскіх ложаў. У масонскіх арганізацыях былі прадстаўлены ўсе асноўныя палітычныя плыні краю, незалежна ад іх нацыянальнай арыентацыі. Масонства прадстаўляла сабою форму самаарганізацыі эліты грамадства.

Культ навукі, розуму і асветы стварыў вакол масонскіх ложаў арэал вольнадумства і таму яны трапілі пад праследаванне

артадоксаў. Касмапалітызм у іх дзейнасці, глыбокая канспіратыўнасць прымусілі ўсведамляць ложы як увасабленне ўсесусветнай змовы, якая робіць падкопы пад дзяржаўную ўладу і грамадскі лад.

Масонства нарадзілася ў Англіі ў пачатку XVIII ст. і пад юрысдыкцыяй Вялікай ложы Англіі пранікла ў Расійскую імперыю, таксама распаўсюдзілася на суседнія тэрыторыі. Вольныя муляры з’явіліся на беларуска-літоўскіх землях дзесьці ў сярэдзіне XVIII ст. Больш актыўна масонскія ложы пачалі стварацца пасля падзелаў Рэчы Паспалітай, далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі і ўсталявання царскай улады. Існуе меркаванне, што царызм свядома ствараў ложы для свайго замацавання на Беларусі. Масонскія арганізацыі былі створаны ў Магілёве, Полацку, Шклове, Нясвіжы і іншых гарадах. Акрамя таго, ложы ствараліся на польскіх і літоўскіх землях. Але адносіны царскіх улад да масонскіх арганізацый былі неадназначнымі. Спачатку царызм падазрона адносіўся да масонаў, але жорстка іх не праследаваў.

Росквіт масонства адбыўся на землях Беларусі ў 1812–1821 гг. пад апекай Аляксандра І, які і сам быў масонам. Асабліва пасля вайны 1812 г. ён рэкамендаваў ствараць масонскія ложы, перш за ўсё, у войску, разлічваючы на тое, што афіцэры, трапіўшыя ў палон, змогуць скарыстацца дапамогай іншаземных сяброў – масонаў. У 1815 г. быў адноўлены “Вялікі ўсход Каралеўства Польскага і ВКЛ”, пачалося адраджэнне ліцвінскага масонства. У 1816 г. масоны Ян Норвід, Міхал Сабескі, Караль Гофман і Ян Ходзька прыехалі ў Вільню і пры дапамозе старэйшага масона прэлата Міхала Длускага пачалі працу ў ложах “Руплівы ліцвін” і “Добры пастыр”. Яны ж адчынілі дзве новыя ложы – “Школу Сакрата” у Вільні і “Палямон” у Расіёнах Ковенскай губерні. У гэты час большая колькасць ложаў знаходзілася на тэрыторыі Гродзенскай і Мінскай губерняў: “Багіня Цэрэра” і “Вузел Еднасці” у Навагрудку, “Сябры чалавецтва” у Гродне, “Шчаслівае вызваленне “ у Нясвіжы, “Паўночная Паходня” у Мінску, “Уладзіслаў Ягайла” у Слуцку і інш. Кіруючым цэнтрам масонства ў Беларусі быў малы Капітул “Святыня спакою”у Нясвіжы, які быў падпарадкаваны “Віленскай ложы “Дасканалая лучнасць”, а праз яе “Вялікаму ўсходу Каралеўства Польскага”. У 1818 – 1819 гг. у Літоўскай правінцыі мелася 12 ложаў. Толькі ў Вільні працавалі правінцыяльная ложа

“Дасканалая лучнасць” і сімвалічныя – “Руплівы ліцвін”, “Храм мудрасці”, “Добры пастыр”, “Школа Сакрата” і “Славянскі арол”.

Цесна звязаны з масонствам былі тайныя таварыствы студэнцкай і вучнёўскай моладзі, ваенныя таварыствы, якія дзейнічалі ў Літве і Беларусі ў першай чвэрці XIX ст. Амаль усе кіраўнікі альбо актыўныя дзеячы тайных таварыстваў у гэты час былі масонамі. Сярод іх Вялегін А.І., Ігельстром К.Г., Чачот Я., Зан Т., Шымкевіч Я. і інш. Сярод мясцовых масонскіх ложаў вылучалася ложа “Руплівы ліцвін”у Вільні, членамі якой былі студэнты і выкладчыкі Віленскага ўніверсітэта. У 1818 г. члены гэтай ложы спрабавалі змяніць масонскі статут і пачаць адкрыта служыць грамадству, ажыццяўляючы дапамогу насельніцтву шляхам навучэння бедных рамёствам, удасканалення тэхнікі, развіцця прамысловасці. Але такая дзейнасць выклікала незадавальненне масонскага кіраўніцтва і ў хуткім часе ложа была вымушана спыніць сваё існаванне.

Масоны выступалі з ідэямі роўнасці ўсіх людзей, вольнасці і братэрства, абмяркоўвалі праблемы развіцця асобы і грамадства ў цэлым, гуртавалі вакол сябе дэмакратычныя сілы грамадства ў напрамку вырашэння галоўнай задачы – адраджэння былой дзяржаўнасці, адраджэння Рэчы Паспалітай. Колькасць братоў у масонскіх ложах на землях Беларусі ў канцы XVIII – першай чвэрці XIX стст. дасягала 1060 чалавек, якія былі аб’яднаны ў 16 арганізацый. Пры гэтым масоны на землях Беларусі мелі добра наладжаныя кантакты з ложамі Польшчы і Расіі, якія вялі барацьбу паміж сабой за ўплыў на масонскія арганізацыі на землях Беларусі і Літвы [7, с. 23]. Барацьба паміж расійскім і польскім “Вялікімі ўсходамі” прывяла да таго, што ў 1820 г. сярод літоўска-беларускага масонства ўзнік праект утварэння самастойнага “Вялікага ўсхода Літоўскага”. Былі зроблены першыя практычныя крокі. Валынскі масон граф Олізар Н. даў 15 тыс. рублёў на будаўніцтва будучай рэзідэнцыі. Рэалізацыі праекта перашкодзіла змена адносінаў улады да масонства і закрыццё ложаў.

Указам Аляксандра I ад 1 жніўня 1822 г. дзейнасць “вольных муляроў” на тэрыторыі дзяржавы была забаронена. Усе дзяржаўныя чыноўнікі, настаўнікі, прафесары, вайскоўцы павінны былі даваць падпіску аб непрыналежнасці да масонскіх і іншых тайных таварыстваў у краі ці за мяжой. Так амаль на стагоддзе перарвалася

традыцыя масонства ў Расійскай Імперыі. У той час у Вільні існавала 6 ложаў. Кіраўнiком адной з іх – “Дасканалая лучнасць” – быў дзед Ромера М. – Юзаф Ромер.

Галоўнай крыніцай па вывучэнню дзейнасці масонскіх ложаў Віленшчыны ў пачатку ХХ ст. з’яўляецца дзённік Міхаіла Ромера (1880-1945). Міхаіл Ромер – вядомы юрыст, навуковец, публіцыст і палітычны дзеяч Літвы (як “гістарычнай,” так і “этнаграфічнай”). Захавалася амаль 40 тамоў яго штодзённых запісаў. Першы быў зроблены 1 студзеня 1911 г., апошні – 18 лютага 1945 г. Дзённік – цікавая крыніца па гісторыі грамадскага, палітычнага і культурнага жыцця беларуска-літоўскага краю. Частка дзённіка, 34 томы, захоўваецца ў аддзеле рукапісаў Цэнтральнай бібліятэкі АН Літвы, астатнія – ў аддзеле рукапісаў Віленскага ўніверсітэта. Міхаіл Ромер быў прыкметнай постаццю ў мясцовай масонскай іерархіі і гэты бок ягонага жыцця і дзейнасці таксама знайшоў адлюстраванне ў яго дзённікавых запісах.

Падчас рэвалюцыі 1905–1907 гг. у імперыі адбылося адраджэнне масонскіх арганізацый. Большасць даследчыкаў лічыць, што гэта адбылося з-за імкнення часткі грамадскіх дзеячоў кансалідаваць сілы падчас рэвалюцыйнага крызісу. Інтэлектуалаў прываблівала таямнічасць і ідэалогія масонаў. Трэба адзначыць, што дзейнасць беларуска-літоўскіх масонаў была цесна звязана з дзейнасцю ложаў у Маскве і Парыжы. У 1906 г. у Маскве была створана ложа “Адраджэнне”, якую ўзначаліў Батэўнаў Н. На пачатку 1907 г. у Пецярбурзе ўзнікла масонская ложа “Палярная Зорка”, кіраўніком якой стаў князь Арлоў-Давыдаў. Абедзве ложы падпарадкоўваліся “Вялікаму ўсходу Францыі”.

Масонскі рух вельмі хутка пашыраўся. У сярэдзіне 1908 г. у масонскіх ложах было каля 40 чалавек, у 1909 – 300–350 чалавек. У адрозненне ад ложаў XVIII–пачаткуXIX стст. змяніўся іх сацыяльны склад. Большасць членаў былі прадстаўнікамі інтэлігенцыі, а не арыстакратыі. Гэта былі адвакаты, універсітэцкая прафесура, лекары, інжынеры і інш. Масоны праследавалі чыста палітычныя мэты. Галоўная з іх - замена самаўладдзя парламенцкім ладам. Іх ідэалогія была блізкай да ідэалогіі лібералізму.

У 1910 г. на тэрыторыі Расійскай імперыі пачалі ўзнікаць масонскія ложы, незалежныя ад Масквы і Пецярбурга. У чэрвені

1910 г. у Варшаве створана ложа “Вызваленне” на чале з Рафалам Радзіловічам, якая таксама належала да “Вялікага ўсходу Францыі”.

Масонскія ложы адыгралі прыкметную ролю ў пашырэнні краёвай ідэі. Масонскія арганізацыі на Беларусі і Літве былі формай існавання нелегальных дэмакратычных таварыстваў краёвага накірунку. Да краёўцаў можна аднесці прадстаўнікоў грамадства Беларусі і Літвы, якія ў сваёй палітычнай і грамадскай дзейнасці выступалі з нацыянальна-культурных, рэлігійных і эканамічных інтарэсаў краю. Краёвая ідэалогія грунтавалася на ідэі адзінай палітычнай нацыі ў Беларусі і Літве [4, с. 19]. Прадстаўнікі масонскіх ложаў адмаўлялі этнакультурныя прынцыпы ў азначэнні нацыянальнага складу насельніцтва. Усе карэнныя жыхары Беларусі і Літвы,на іх думку, якія лічаць сваёй радзімай гістарычную Літву і ўсведамляюць сябе грамадзянамі краю, належаць да адзінай нацыі “ліцвінаў”. Этнічнае паходжанне і культурная прыналежнасць адыгрывалі другарадную ролю. У сваёй практычнай дзейнасці краёўцы прызнавалі роўнасць палякаў, беларусаў, літоўцаў і яўрэяў як карэнных народаў Беларусі і Літвы, нягледзячы на рознасць моў. Усе “грамадзяне” беларускай і літоўскай зямлі павінны былі працаваць на карысць краю, пад якім звычайна разумелі землі былога ВКЛ.

Адным з галоўных прыхільнікаў краёвай ідэалогіі быў Міхаіл Ромер – адзін з арганізатараў масонства на беларуска-літоўскіх землях у пачатку ХХ ст. Менавіта краёвасць для яго з’яўлялася найбольш адэкватнай формай існавання і рэалізацыі масонскіх лозунгаў на тэрыторыі гістарычнай Літвы. Трэба адзначыць, што Ромер М. успрыймаў грамадства беларуска-літоўскага краю як адзінае і непадзельнае, прасякнутае пачуццём краёвай грамадзянскасці і незалежнае ад падзелу на асобныя этнасы. [6, с. 165]. Пры гэтым члены масонскіх ложаў не абмяжоўваліся сваім актыўным удзелам у сваіх нацыянальных рухах.

У 1910 г. у Вільне ўзнікла ложа “Еднасць”(альбо “Лучнасць”). Сярод ініцыятараў яе ўтварэння былі браты Антон і Іван Луцкевічы. Узначаліў ложу дзеяч яўрэйскага руху, прыхільнік краёвай ідэалогіі Ежы Ром. Акрамя іх, “братамі” ложы былі Красоўскі І., Зыгмунд Нагродскі, Браніслаў Крыжаноўскі, Вітольд Абрамовіч, Іван Прозараў, Эніам Ром, Брамсан і Данатас Малінаўскас. Звычайна ложа налічвала не менш за сем братоў і не больш за чатырнаццаць.

Калі набіралася больш за чатырнаццаць чалавек, ложа падзялялася напалову і ўзнікала новая. У сакавіку 1911 г. у ложу быў прыняты Міхаіл Ромер. Афіцыйнае запрашэнне да ўступлення ён атрымаў ад Івана Луцкевіча.

Вось што запісаў у сваім дзённіку Ромер: “Увечары прыйшоў Іван Луцкевіч і паведаміў, што ў нядзелю мясцовая масонская ложа прыняла мяне ў свой звяз. Калі гэта не фарс, не якое-небудзь няспелае пачынанне жменькі летуценнікаў, а сапраўдная масонская арганізацыя, то я ўсім сэрцам далучуся да звязу”. Неўзабаве Ромер стаў адным з кіраўнікоў віленскага масонства.

У “Еднасці” былі прадстаўлены ўсе асноўныя этнасы беларуска-літоўскага краю. “Браты” прытрымліваліся прынцыпаў краёвай ідэалогіі, успрыймалі грамадства беларуска-літоўскага краю як адзінае і непадзельнае на асобныя этнасы, выступалі за дэмакратычны лад жыцця. Краёвая ідэалогія супрацьстаяла ідэалогіі этнічнага шавінізму. У палітычным плане масоны выступалі за ўстанаўленне парламенцкай рэспублікі і аўтаноміі “гістарычнай Літвы” як дзяржаўнага ўтварэння беларусаў і літоўцаў у межах дэмакратычнай, федэратыўнай Расіі.

У 1911 г. пачала дзейнічасць ложа “Літва”, якая ўваходзіла ў “Вялікі ўсход народаў Расіі” – арганізацыя аб’ядноўвала каля 40 ложаў. У склад ложы ўваходзілі Крыжаноўскі Б., Нагродскі З., Сляжэвічус М., Краскоўскі І., Ром Э., Луцкевіч А., Шаўліс Ю., а з 1912 г. – Ластоўскі В. і інш. “Літву” узначаліў Ромер М. Даволі хутка Ромер стаў адным з кіраўнікоў масонаў на беларуска-літоўскіх землях. У сваім дзённіку ён пісаў: “Нашыя прынцыпы – братэрства, любоў і свабода чалавечага духу. Мы гуманісты ў самым высакародным і дзейным значэнні гэтага слова. Мы імкнёмся, каб гэтыя прыгожыя словы сталі рэальнасцю сумлення, дзеянняў і чалавечых адносін. Мы не выступалі супраць агульначалавечых каштоўнасцяў”.

Задачы і прынцыпы дзейнасці масонскіх ложаў, па меркаванню Ромера М., былі наступнымі: “Мы вельмі далёкія ад перакананняў, што мэта апраўдвае сродкі, што з дапамогай хлусні, крывадушнасці і гвалту ці якога іншага амаральнага сродку можна стварыць якое-небудзь трывалае і надзейнае. Гэта памылковы погляд, што “Вольныя муляры” маюць пэўныя антыграмадскія або антыкультурныя мэты, імкнуцца да панавання і знішчэння чалавечай культуры.

Наша задача – не знішчаць, не ламаць, не разбураць, а ствараць і ўдасканальваць.” “Вольныя муляры” абавязаны былі мець актыўную жыццёвую пазіцыю, каб пастаянна рэалізоўваць масонскія прынцыпы гуманізму. Закранаючы палітычны аспект масонскай дзейнасці, Ромер падкрэсліваў, што “брацтва” не з’яўляецца ні палітычным аб’яднаннем, ні партыяй, але ва ўмовах расійскай дзяржавы арганізацыя будзе займаць антыўрадавую палітычную пазіцыю”[3, с. 65]. Кожны член ложы ў любы момант мог пакінуць яе, але ён павінен быў прытрымлівацца адной абавязковай умовы: захоўваць таемнасць самаго факту існавання “Вольных муляроў”.

Пасля ўзнікнення “Еднасці” і “Літвы” многія пытанні дзейнасці краёўцаў абмяркоўваліся на сходах. Там вырашалася і праблема іх органу друку. Тагачасны орган “Przeglad Wilenski” (1911–1915), рэдактарам якога быў Людовік Абрамовіч, выклікаў незадавальненне. Газета лічылася шавіністычнай па сваёй сутнасці. Было прынята рашэнне арганізаваць новае краёвае выданне. У 1912 г. выйшаў першы нумар “Kuriera Krajowego”. Газета была разлічана на пашырэнне краёвай ідэі сярод польскай грамадскасці краю. “Kurier Krajowy” літаральна патрабаваў ад польскай інтэлігенцыі дапамагаць культурнаму адраджэнню беларусаў і літоўцаў. Шмат увагі газета надавала беларускаму нацыянальнаму руху, адлюстроўвала яго характар і тэндэнцыі.

Віленскія ложы сталі моцнымі цэнтрамі прапаганды ліберальна-дэмакратычнага накірунку краёвай ідэалогіі. Гэтаму спрыяла грамадска-палітычная і культурная дзейнасць віленскіх “братоў”. Амаль усе яны былі аўтарытэтнымі дзеячамі розных этнічных рухаў і ўплывалі на міжэтнічныя адносіны. Свае разважанні па розным праблемам грамадскасці яны публікавалі на старонках папулярных віленскіх выданняў “Lieturas Zinios”, “Наша Ніва”, “Вечерняя газета” і г. д. Прадстаўнікі ложаў уваходзілі ў склад шмат якіх культурных і грамадскіх арганізацый, дзейнасць якіх выходзіла за межы Віленшчыны (літоўскае Артыстычнае таварыства, Таварыства падтрымкі кааперацыі. польскае Таварыства сяброў навук і г.д.).

У 1913 г. віленскае масонства ўступіла ў паласу крызісу, які досыць хутка быў пераадолены. У выніку ў кастрычніку 1914 г. у Вільні была створана ложа “Беларусь”. У яе склад увайшлі

Луцкевіч А., Булёта А., Бугайлішкіс П, Біржышка М., Краскоўскі І., Заўштоўт А. і Астахевіч К. Сходы гэтай ложы праходзілі разам са сходамі "Літвы". Пэўнае арганізацыйнае афармленне ложы намячалася на восень 1915 г., аднак Першая сусветная вайна ўнесла пэўныя карэктывы ў гэтыя планы. У гэты час адбывалася абвастрэнне этнічных адносін у краі, што адчувалася ў дзейнасці этнічна змешаных масонскіх арганізацый. Ложы пачалі адасобліваццa па нацыянальнай прыкмеце.

Пэўны ўплыў на становішча віленскіх масонскіх ложаў адыграла пагаршэнне адносін з масонамі з Масквы і Пецярбургу. Рост вялікадзяржаўных шавіністычных настрояў у Расіі адбіўся на пазіцыі кіраўніцтва "Вялікага ўсходу Расіі". Гэта вельмі адчувалася падчас з'езду (канвенту) у Пецярбурзе ў 1914 г. У ім прымалі ўдзел больш за 30 дэлегатаў з усёй Расіі. Дэлегатамі ад Вільні былі Міхаіл Ромер і Антон Луцкевіч. Канвент праходзіў у даволі складаных умовах. Паводле сваіх палітычных сімпатый яго ўдзельнікі належалі да розных палітычных партый (ад кадэтаў да трудавікоў). На канвенце была спроба навязаць ложам вялікадзяржаўную пазіцыю замест ідэі свабоднай федэрацыі ўсіх народаў імперыі.

Антон Луцкевіч выступаў за захаванне нейтралітэта ў дачыненні да ваюючых бакоў. Перамогу царызма ён лічыў найгоршым з магчымых вынікаў вайны. Акрамя таго, дэлегаты з'езда не прынялі прапанаваную Луцкевічам і Ромерам рэзалюцыю аб прызнанні прынцыпа аўтаноміі Беларусі і Літвы. Кантакты з расійскімі масонамі выявілі ўсю няшчырасць ранейшых запэўніванняў кіраўнікоў "Вялікага ўсходу Народаў Расіі" наконт магчымасцей свабоднага (аўтаномнага) развіцця беларуска-літоўскага краю ў выпадку іх прыхода да ўлады.

Гэта падштурхнула да ўзнікнення сваёй уласнай масонскай арганізацыі, незалежнай ад расійскага масонства, якая б ахоплівала ўсе землі былога Вялікага Княства Літоўскага. Ложа павінна была выступаць за яго ўласнае развіццё, нацыянальнае аднаўленне і развіццё ўласнай культуры. Але каб ажыццявіць гэтую ідэю, патрэбна было стварыць 7 ложаў на Беларусі і ў Літве. А ў гэты час іх дзейнічала толькі 5 (у Вільні, Мінску, Віцебску і інш.).

Розніца ў поглядах на будучыню Беларусі і Літвы непазбежна прывяла да разрыву з расійскім масонствам. Апошнім актам узаемадзеяння быў удзел дэлегатаў Вільні Андрэя Булёты і

Аляксандра Заштаўта ў масонскім канвенце ў Пецярбурзе ў маі 1915 г.

Пэўныя карэктывы ў дзейнасць і погляды братоў унесла Першая сусветная вайна. У канцы 1914 – пачатку 1915 гг. паміж імі пачаліся першыя непаразуменні, так называемы "беларуска-літоўскі канфлікт". Літоўцы выступалі за аўтаномію "этнаграфічнай Літвы" з прылеглымі тэрыторыямі (Гродзеншчыны, Міншчыны са сталіцай у Вільні). Беларусы адстойвалі ідэю аўтаноміі "гістарычнай Літвы" з сталіцай у Вільні, якую лічылі сталіцай усяго краю. Дасягнуць міжнацыянальнага паразумення адносна будучыні беларуска-літоўскіх зямель прадстаўнікі масонскіх ложаў не здолелі.

У маі 1915 г. Ромер М. пакінуў Вільню. Ён перайшоў лінію фронту і далучыўся да легіёнаў Пілсудскага Ю. Яго ад'езд нанёс моцны ўдар па дзейнасці віленскіх масонаў. Спроба выправіць сітуацыю была зроблена Юргісам Шаўлюсам, калі па яго ініцыятыве рэшткі трох віленскіх ложаў аб'ядналіся ў адну самастойную арганізацыю "Вялікі ўсход Літвы" і афіцыйна сталі самастойнымі, адмовіліся падпарадкоўвацца кіруючаму цэнтру расійскіх масонаў, што было абумоўлена рознымі поглядамі на будучыню Літвы і Беларусі [1, с. 35]. Па меркаванню Смаленчука А., сябрамі гэтай ложы хутчэй за ўсё з'яўляліся Шаўлюс Ю. (кіраўнік), Вілейшыс Ё., Астахевіч К., Асмалоўскі У., браты Луцкевічы, Ром Е., Брамсон М. і інш [6, с. 172]. Кіраўнікі расійскіх масонаў не прызнавалі правы беларускага і літоўскага народаў на самавызначэнне. У гэтай арганізацыі была досыць моцная краёвая ідэя, якая вельмі актыўна прапагандавалася беларусамі. У палітычным плане "сябры" ложы выступалі за зверджэнне самадзяржаўя і ўсталяванне парламенцкай дэмакратычнай рэспублікі ў Расіі, адстойвалі поўную незалежнасць "гістарычнай Літвы" як дзяржаўнага ўтварэння беларусаў і літоўцаў.

Менавіна беларусы былі ў снежні 1915 г. аднымі з ініцыятараў утварэння "Канфедэрацыі Вялікага княства Літоўскага". "Вялікі ўсход Літвы" адыграў галоўную ролю ў стварэнні Часовай Рады і выданні "Універсалу", які заклікаў да аднаўлення беларуска-літоўскай дзяржавы. Але паступова ложа спыніла сваю дзейнасць, у першую чаргу з-за этнічных супярэчнасцей. Месца масонаў займалі беларускія і літоўскія грамадска-палітычныя арганізацыі, якія ў

перыяд акупацыі нямецкімі войскамі Літвы і часткі Беларусі легалізавалі сваю дзейнасць.

Зрабіўшы агляд дзейнасці масонскіх ложаў на беларуска-літоўскіх землях у XIX – пачатку XX стст., можна зрабіць наступную выснову. Масонскія ложы – гэта вельмі складаная і супярэчлівая з’ява. Масоны адыгралі важную ролю ў развіцці і пашырэнні нацыянальнай ідэі і краёвай ідэалогіі, барацьбе з існуючым рэжымам, прапагандавалі ідэю этнічнай талерантнасці і былі супраць этнічнага шавінізму. Многія беларускія дзеячы былі актыўнымі ўдзельнікамі масонскага руху, які ў перадваенны час набыў у Віленскай губерні значны размах. Але іх дзейнасць не заўсёды была паслядоўнай. Галоўнае тое, што масоны заўсёды падтрымлівалі ідэі гуманізму і дэмакратыі, прапагандавалі каштоўнасць гэтых ідэй сярод насельніцтва. Дзейнасць ложаў была непарыўна звязана з нацыянальна-вызваленчым рухам у Літве і Беларусі. Іх задачай было дасягненне палітычнай і культурнай самастойнасці краю. Менавіта таму яны і падтрымлівалі ідэю стварэння беларуска-літоўскай дзяржавы ў форме “Канфедэрацыі Вялікага княства Літоўскага”.

**Выкарыстаная літаратура**


1. Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці / [М.П. Касцюк і інш.]. – Мінск: Беларуская навука, 2008. – 614 с.
2. Дабранскі, С. Нарысы з гісторыі масонства ў Літве. / С. Дабранскі // Спадчына. – 1997. – № 3. – С. 60-74.
3. Смалянчук, А. Дзеннік М. Ромера. / А. Смалянчук. // Спадчына. – 1998. – № 5. – С. 59-67.
4. Смалянчук, А. “Краёвасць” у беларускай и літоўскай гісторыі 1905-1940. / А. Смалянчук // Беларускі гістарычны агляд. – 1997. – Т. 4. – Сш. 1-2. – С. 19-33.
5. Смалянчук, А. З гісторыі віленскага масонства XX ст. / А. Смалянчук // Спадчына. – 1998. – № 5. – С. 50-59.
6. Смалянчук, А. Адраджэнне вольнага мулярства на беларускіх і літоўскіх землях на пачатку XX ст. // Вольныя муляры у беларускай гісторыі. Канец XVIII – пач. XX ст. / Беларускае гістарычнае таварыства. – Вільня: Gudas, 2005. – С. 157-185.

7. Швед, В.В. Масоны і ложы на землях Беларусі (канец XVIII – першая чвэрць XIX ст.). / В.В. Швед. – Гродна: ГрДУ, – 2007. – 275 с.

## К ВОПРОСУ О СОСТОЯНИИ ПОЛИЦЕЙСКОЙ СЛУЖБЫ В РОССИЙСКОЙ ИМПЕРИИ

Богданович А.И.,
кандидат исторических наук, доцент

Во второй половине XIX в., в советское время, даже на постсоветском пространстве в общественном сознании и в исторических исследованиях широко утвердилось и сохраняется убеждение о том, что царская Россия была полицейским государством, в котором каждый шаг человека, особенно прогрессивно настроенного и оппозиционного власти, находился под бдительным контролем полиции или жандармов. Формированию такого убеждения посодействовали представители как русской литературы, так и революционно-демократических течений дореволюционной России, под влиянием которых оказались не только простые обыватели, но даже советские и постсоветские ученые историки. Так, Лермонтов М.Ю. в 1830-е гг. писал о Петербурге: «Увы! Как скучен этот город, со своим туманом и водой!.. Куда ни взглянешь, красный ворот, как шишь торчит перед тобой [1, с. 154]. Под красным воротом понимался полицейский. А еще общеизвестно стихотворение, которое появилось в 70-е годы XIX в. и усилиями. Бартенева П.И было приписано Лермонтову М.Ю., а затем было напечатано в полном собрании сочинений поэта: «Прощай, немытая Россия, страна рабов, страна господ. И вы, мундиры голубые, и ты, им преданный народ. Быть может, за стеной Кавказа сокроюсь от твоих пашей, от их всевидящего глаза, от их всеслышащих ушей [1, с. 375]. Под голубыми мундирами понимались мундиры корпуса жандармов.

Для подтверждения полицейского характера российской империи часто цитируется также высказывание генерала Ермолова А.П.: «В России на каждом голубой мундир, а если не мундир, то голубая подкладка, если не подкладка, то голубая заплатка». В советское время все эти высказывания тщательно выискивались и повсемест-